УДК 821.161.3

# РОЛЯ БЕЛАРУСКАЙ КАЗКІ Ў СТАНАЎЛЕННІ СВЕТАПОГЛЯДУ СУЧАСНАЙ МОЛАДЗІ

*Маркелава А. В.*

*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі» філіял «Мінскі радыётэхнічны каледж», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік: Блінова А. М. – выкладчык вышэйшай катэгорыі дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла*

**Анатацыя**. Вызначэнне ролі народных казак у жыцці сучаснай моладзі. Даследаванне праблемы зацікаўленнасці падлеткаў да народных казак.

**Ключавыя словы:** казка, беларуская народная казка, казка літаратурная, фальклорная казка, светапогляд.

***Уступ.*** Казка – найбольш яркі і захапляльны па сваім змесце і паэтычным афармленні жанр вуснай народнай творчасці. Падзеі ў казках заусёды цікавыя, займальныя, носяць алегарычны характар, уносяць чалавека ў свет мары. Казкі маюць павучальны характар, а таксама выражаюць народную мараль: любоў да роднай зямлі, роднай хаты, сям'і, праслаўленне мудрасці, мужнасці, кемлівасці, асуджэнне здраднікаў, гультаёў. Казкі з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай мудрасці.

З калыскі казкі ўваходзяць у наша жыццё: іх расказваюць мамы і бабулі, старэйшыя браты і сёстры, таты і дзядулі, чытаюць у дзіцячых садках выхавацелі. На свядомым узроўні дзіця можа не зразумець закладзены ў яе сэнс. Аднак менавіта ў момант слухання у глыбіні душы адбываюцца пераўтварэнні. Казкі спрыяюць імкненню дзяцей да гераічнага, да ўсяго яркага і незвычайнага, фарміруюць іх здольнасці здзіўляцца, перабольшваць, фантазіраваць. Казачныя сітуацыі і канфлікты не толькі даступныя і зразумелыя дзецям, яны глыбока закранаюць іх пачуцці. У казках станоўчы герой трапляе ў вельмі складаныя сітуацыі, на яго шляху шмат перашкод і выпрабаванняў, але ён іх адольвае. У казцы заўсёды зло караецца, справядлівасць усхваляецца. Усім сваім паэтычным ладам казка вучыць дзяцей пасцігаць народнае ўяўленне пра добрае і злое; высокае, сумленнае і агіднае, нізкае; гуманнае і жорскае. Прычым у казцы гэта паказана "буйным" планам.

***Асноўная частка.*** Фальклорная казка – эпічны жанр вуснай народнай творчасці, празаічны вусны аповед аб выдуманых падзеях у фальклоры розных народаў. Гэта від апавядальнага, у асноўным празаічнага, фальклору (казачная проза), які ўключае ў сябе разнажанравыя творы, тэксты якіх абапіраюцца на выдумку. Казачны фальклор супрацьстаіць «пэўнаму» фальклорнаму апавяданню – міф, быліна, гістарычная песня, духоўны верш, легенда, паданне. Народныя казкі не маюць аўтараў, іх складальнік – народ.

Літаратурная казка – эпічны жанр, арыентаваны на выдумку твор, цесна звязаны з народнай казкай, але, у адрозненне ад яе, належыць пэўнаму аўтару. Такая казка не існавала да публікацыі ў вуснай форме і не мела варыянтаў.

Беларускія літаратурныя казкі маюць падабенства з казачным эпасам славян, асабліва бліжэйшых суседзяў, рускіх і ўкраінцаў, але ў іх ёсць адметныя рысы. Ствараючы сваю суцэльную прастору персанажаў, тэм і сюжэтаў, ім уласцівы глыбокая народная мудрасць, высокая паэтычнасць вобразаў, нязломная і светлая вера ў чалавека, у яго сілы і магчымасці, маральная цнатлівасць і чысціня, непараўнаны, непераймальны гумар і вострая сатыра, прастата і даступнасць зместу, займальнасць апавядання. Самыя вядомыя казачнікі ў беларускай літаратуры: Цётка, Я. Колас, З. Бядуля, А. Вольскі, У. Караткевіч, У. Дубоўка, А. Якімовіч і інш.

Асобае месца ў маральным выхаванні дзяцей беларусаў займалі народныя казкі – скарбніцы народнай мудрасці, – што былі ў паўсядзённым ужытку старэйшага і малодшага пакаленняў.

Асноўным адрозненнем беларускіх народных казак зяўляецца моцная міфічная аснова. Казкі данеслі да нас з ранейшых часоў шматлікія рысы побыту і светаўспрымання, якія былі страчаны ў фальклоры іншых славянскіх народаў. Каля 50 сюжэтных тыпаў беларускіх казак не маюць аналагаў у міжнародных паказальніках казачных сюжэтаў. Некаторыя жанры ў беларусаў куды багацейшыя, чым у суседзяў: напрыклад, у беларускім рэпертуары каля 500 сюжэтаў легендарных казак, ва ўкраінскім – 196, а ў рускім – 56. Адметная асаблівасць беларускага казачнага эпасу – казкі аб гераічных волатах-асілках, якія перамагаюць розных пачвар («Каваль-волат», «Удовін сын»). Да больш позніх адносяцца казкі сацыяльна-бытавыя («Пану навука», «Мужык і пан», «Зайздросны поп»). Многія беларускія народныя казкі, асабліва бытавыя, прасякнуты жыццярадасным гумарам.

Сёння мы сутыкнуліся з праблемай страты цікавасці сучасных дзяцей да народных казак. Не так актыўна знаёмяцца сучасныя дзеці з народнай казкай, надрукаванай у кнігах, і ўсё больш надаюць увагі казкам, што прыйшлі з-за мяжы, чужому для нас казачнаму эпасу. Гэта тлумачыцца тым, што паводле большасці замежных казак зняты прыгожыя мастацкія фільмы і мультфільмы. Яны яркія, запамінальныя і захапляльныя на экране. Ім і аддаецца ўвага сучасных дзяцей.

З мэтай даследвання дадзенай тэмы намі было праведзена апытанне сярод сучасных падлеткаў і дарослых, якое ўключала наступныя пытанні: “Назавіце 1–2 казкі, якія вам падабаліся ў дзяцінстве? Якія казкі вам падабаюцца больш за іншыя: А) замежныя; Б) народныя; В) не з’яўляюся аматарам казак, не цікаўлюся імі”.

З 73 апытаных падлеткаў толькі 7 аддалі свае галасы за народныя казкі, што склала толькі 9% ад агульнай колькасці; 73 % з’яўляюцца аматарамі замежных казак (сярод любімых лідзіруюць – “Папялушка”, ”Чырвоны капялюшык”, ”Тры парасяці”); 18 % зусім не цікавяцца казкамі. У сваю чаргу апытанне сярод дарослых паказала кардынальна іншыя вынікі. Прынялі ўдзел у апытанні 54 дарослыя, і значная большасць аддала перавагу народным казкам – 84 % (любімыя – “ Не сілай, а розумам”, “Сабака і воўк”, “Лісіца і дрозд”), 6 % – замежным і 10 % зусім не цікавяцца казкамі.

Беларускія народныя казкі вучаць "залатому правілу" маралі: "Як ты да людзей, так і людзі да цябе", "Як гукнеш, так і адгукнецца". Сярод беларускіх казак, якія спрыяюць разуменню гэтых правілаў жыццёвай мудрасці, варта назваць казку "Лісіца і жораў", якая па сваёй нагляднасці і вобразнасці даступная нават маленькім дзецям. Казкі вучаць правілам узаемаадносін паміж бацькамі і дзецьмі. Ухваляюць паважлівыя адносіны да бацькоў і асуджаюць эгаізм, непавагу да іх (казкі "Недалікатны сын", "Каваль-багатыр”, “Стары бацька”). Выхаванню працавітасці, сумленных адносін да людзей вучаць казкі "Пшанічны каласок", "Лёгкі хлеб", "Пчала і муха" і іншыя. У беларускіх народных казках працавітасць і дысцыплінаванасць прывіваюцца шляхам асуджэння дармаедтсва, ляноты ("Хомкава жонка", "Аб тым, як ксяндзы вылечыліся"). Выхаванню станоўчых маральных якасцей дапамагаюць таксама казкі, у якіх высмейваецца скупасць, непавага да старасці ("Шаптуха", "Прагны багацей"). Сціпласці вучаць казкі "Ганарыстая варона", "Самы разумны"; смеласці і мужнасці – "Не сіла, а смеласць", "Як кот звяроў напалохаў"; гасціннасці – "Як кум у кума гасцяваў". Выхаванню калектывізму, узаемадапамогі, узаемавыручкі, сяброўства могуць дапамагчы такія казкі, як "Зайкава хатка", “Казка пра бычка і яго сяброў". Беларускія народныя казкі вучаць таксама быць добрым сем'янінам – “Як чорт мужыку вочы адкрыў”, “За што мужык пану бараду абгаліў”. Сумленнасці і праўдзівасці вучаць казкі "Крыўда і праўда", "Удовін сын", "Козы".

***Заключэнне.*** Кожны, хто хоча ведаць гісторыю свайго народа, яго мары, імкненні, хто хоча жыць у адпаведнасці са спрадвечнымі народнымі ўяўленнямі пра добрае і злое, высокае і нізкае, павінен ведаць і яго казкі. Казка – гэта не проста забава, яна ратавальнік, натхняльнік і сямейная рэліквія, якая з дзяцінства прысутнічае ў жыцці кожнага чалавека. У ёй хаваюцца назапашаныя стагоддзямі і пакаленнямі веды, па зярнятку адабраная найбольш важная і патрэбная інфармацыя. Гэта пасланне нашчадкам пра тое, як жыць, любіць, сябраваць, дзейнічаць у складаных сітуацыях, як будаваць сям'ю, адносіны паміж мужчынам

і жанчынай, паміж бацькамі і дзецьмі. Казка надзвычай шматгранная. Яе можна разглядаць з педагагічнага, псіхалагічнага, тэрапеўтычнага пунктаў гледжання.

Беларускія казкі маюць свае асаблівасці. У іх закладзены жыццёвая мудрасць і вопыт, транслююцца духоўныя якасці і каштоўнасці, уласцівыя менавіта беларускім людзям. Беларусы вядомыя ў свеце сваёй мяккасцю, дабрынёй, талерантнасцю, смеласцю, працавітасцю, цярплівасцю, вынаходлівасцю, дасціпнасцю і выдатным пачуццём гумару. А нашы казкі вучаць выжываць у сітуацыях, дзе выжыць амаль немагчыма.

У чым роля народнай казкі ў жыцці чалавека? Чаму так важна яе захаваць? Яшчэ Максім Танк вызначыў, што менавіта народныя казкі вучаць любіць родную мову, выхоўваюць імкненне да высокага, прыгожага, заклікаюць “з няпраўдай змагацца, а з праўдай дружыць”, нараджаюць у чалавека высакародныя імкненні і выклікаюць жаданне іх ажыццяўляць.

Я спадзяюся, што з цягам часу наша моладзь праявіць большую зацікаўленнасць да беларускага фальклору, да народнай казкі. Для гэтага я прапаную вярнуцца ў дзяцінства. Вядома, гэта немагчыма зрабіць у рэальнасці, але можна зрабіць віртуальна. Арганізацыя інсцэніровак, кніжных выстаў з народнымі казкамі, літаратурныя конкурсы і віктарыны змогуць павысіць цікавасць сучаснай моладзі да народных казак.

## *Спіс літаратуры*

1.*Кабашнікаў, К. П. Беларуская казка ў казачным эпасе славян / К. П. Кабашнікаў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1968. — 27 с.*
2.*Кабашнікаў, К. П. Сустрэчы з казкай : Кніга для настаўніка / К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч. — Мінск : Народная асвета, 1984. — 95 с.*
3.*Сравнительный указатель сюжетов : Восточнославянская сказка : указатель / сост. Л. Г. Бараг [и др.]. — Ленинград : Наука. Ленингр. отделение, 1979. — 438 с.*
4.*«Народныя казкі-байкі, апавяданні і мудраслоўі» пад рэдакцыяй Н. С. Гілевіча*
5.*Кабашнікаў К. П. Паказальнік сюжэтаў беларускіх казак. — У кн.: Чарадзейныя казкі. Частка II. Мінск, 1978, с. 603—686.*
6.*Інтэрнэт-рэсурсы: Wikipedia* .

UDC 821.161.3

# THE ROLE OF THE BELARUSIAN FAIRY TALE IN SHAPING THE WORLDVIEW OF MODERN YOUTH

*Markelava A.V.*

*Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics*
*affiliate Minsk Radioengineering College, Minsk, Republic of Belarus*

*Blinova E.N. – teacher of the highest category in Social and Humanitarian disciplines*

**Abstract.** Definition of the role of folk tales in the life of modern youth. Study of the problem of teenagers’ interest in folk tales.

**Keywords:** fairy tale, Belarusian folk tale, literary tale, worldview.